КАНСТЫТУЦЫЯ

БУДУЕМ НОВУЮ БЕЛАРУСЬ РАЗАМ

АРГАНІЧНЫ ЗАКОН

# АБ КАНСТЫТУЦЫЙНЫМ СУДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Праект для грамадскага абмеркавання

02.05.2023

## ЗМЕСТ

***РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ*** ***4***

ГЛАВА 1. СТАТУС КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 4

ГЛАВА 2. ФАРМАВАННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 7

ГЛАВА 3. СТАТУС СУДДЗІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 10

***РАЗДЗЕЛ II. СТРУКТУРА І АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ*** ***12***

ГЛАВА 4. АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 12

ГЛАВА 5. АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 13

***РАЗДЗЕЛ III. КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ СУДАВОДСТВА*** ***16***

ГЛАВА 6. ЗВАРОТ У КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І АДКРЫЦЦЁ СУДАВОДСТВА 16

ГЛАВА 7. ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ 21

ГЛАВА 8. АСАБЛІВАСЦІ ВЫТВОРЧАСЦІ ПА СПРАВАХ АБ ЗМЯШЧЭННІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ПАСАДЫ У ПАРАДКУ ПУНКТА 4 АРТЫКУЛА 92 КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 25

ГЛАВА 9. РАШЭННІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 26

***РАЗДЗЕЛ IV. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ*** ***29***

ГЛАВА 10. ЗАКЛЮЧНЫЯ І ПЕРАХОДНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АРГАНІЧНАГА ЗАКОНА 29

Праект[1] 02.05.2023

# АРГАНІЧНЫ ЗАКОН
# АБ КАНСТЫТУЦЫЙНЫМ СУДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сойм Рэспублікі Беларусь

- кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь,

- разумее важнасць інстытута канстытуцыйнай юстыцыі для станаўлення і ўмацавання прававой дзяржавы і плюралістычнай дэмакратыі, эфектыўнай абароны і заахвочвання правоў і свабод чалавека,

- асуджае выкарыстанне аўтарытарным рэжымам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у якасці інструмента ўмацавання дыктатуры і абгрунтавання рэпрэсіўнай палітыкі супраць грамадзянскай супольнасці, у тым ліку той, якая выявілася ў здзяйсненні злачынстваў супраць чалавечнасці,

- стварае юрыдычныя перадумовы, каб падобная практыка дыскрэдытацыі канстытуцыйнага правасуддзя назаўжды засталася ў мінулым,

- імкнецца стварыць якасна новы Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, дзейнасць якога была б заснавана на вяршэнстве права дэмакратычнай дзяржавы і адпавядала б прагрэсіўным еўрапейскім стандартам канстытуцыйнай юстыцыі,

а таксама пераследуе мэты:

- забяспечыць незалежнасць Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго суддзяў для эфектыўнага гарантавання вяршэнства Канстытуцыі, канстытуцыйнага правапарадку і адпраўлення канстытуцыйнага правасуддзя,

- гарантаваць эфектыўную абарону канстытуцыйных правоў і свабод шляхам індывідуальнага доступу да канстытуцыйнага правасуддзя,

- стварыць спрыяльныя юрыдычныя ўмовы для празрыстай і публічнай дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго адкрытасці грамадзянскай супольнасці,

- стварыць юрыдычныя перадумовы для эфектыўнай арганізацыі працы Канстытуцыйнага Суда,

- закласці юрыдычную аснову для аптымальнага канстытуцыйнага судаводства, якая гарантуе адпраўленне якаснага канстытуцыйнага правасуддзя ў найкарацейшыя магчымыя тэрміны,

- устанавіць зразумелае, сістэмнае і паслядоўнае рэгуляванне дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь,

прымае гэты Арганічны закон «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь» (далей - Арганічны закон).

[1] Праект Арганічнага закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь» распрацаваны ў адпаведнасці з праектам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, распрацаваным Грамадскай канстытуцыйнай камісіяй https://kanstytucyja.online/index.php/text/by

# РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Прадмет рэгулявання гэтага Арганічнага закона**

1. Гэты Арганічны закон рэгулюе прававы статус Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, уключна з забеспячэннем незалежнасці ды іншых гарантый дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго суддзяў, будовай і арганізацыяй працы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, уключна з парадкам прызначэння і спынення паўнамоцтваў суддзяў і ўнутранай арганізацыйнай структурай Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, уключна з асаблівасцямі ажыццяўлення паўнамоцтваў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, асновамі канстытуцыйнага судаводства і выкананнем рашэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Калі гэтым Арганічным законам не прадугледжана іншае, статус суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь рэгулюецца арганічнымі законамі аб судаўладкаванні і статусе суддзяў.

3. Калі гэтым Арганічным законам не прадугледжана іншае, дзейнасць супрацоўнікаў канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь рэгулюецца законамі аб дзяржаўнай службе.

## ГЛАВА 1. СТАТУС КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 2. Азначэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь - орган судовай улады, які гарантуе вяршэнства Канстытуцыі і права, канстытуцыйны правапарадак і ажыццяўленне канстытуцыйнага правасуддзя.

**Артыкул 3. Прававая аснова дзейнасці Канстытуцыйнага Суда**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе сваю дзейнасць выключна на падставе і ў межах паўнамоцтваў, вызначаных Канстытуцыяй.

2. У сваёй дзейнасці Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь таксама кіруецца гэтым Арганічным законам, іншымі законамі і нарматыўнымі актамі, якія не супярэчаць Канстытуцыі, у тым ліку і з міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь.

3. Арганізацыя ўнутранай працы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і працэдурныя правілы разгляду ім справаў дэталізуюцца ў Рэгламенце Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 4. Прынцыпы дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе сваю дзейнасць па наступных прынцыпах:

1.1. вяршэнства Канстытуцыі і права, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прымае свае рашэнні строга на падставе Канстытуцыі і забяспечвае яе вяршэнства ў спалучэнні з вяршэнствам права, якое заснавана на прызнанні непахіснасці каштоўнасцяў плюралістычнай дэмакратыі, правоў чалавека і павагі міжнароднага права;

1.2. незалежнасці, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь і суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць свае канстытуцыйныя паўнамоцтвы незалежна, без умяшальніцтва або ўказанняў іншых

органаў улады, іншых судоў, службовых асоб, іншых фізічных і юрыдычных асоб, а таксама нягледзячы на пазіцыю палітычных партый, грамадскіх арганізацый і вынікі апытанняў грамадскай думкі;

1.3. бесстароннасці і аб'ектыўнасці, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае канстытуцыйныя звароты непрадузята ні да аднаго з бакоў, з роўнай павагай да іх і выконвае роўнасць працэсуальных правоў бакоў, поўнасцю і ўсебакова ацэньвае фактычныя і юрыдычныя абставіны, аргументы і довады бакоў, прымае абгрунтаваныя і матываваныя канстытуцыйнымі аргументамі рашэнні ды іншыя акты канстытуцыйнага правасуддзя;

1.4. справядлівасці, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе канстытуцыйнае правасуддзе прымаючы не фармальна, а па сутнасці справядлівыя рашэнні і іншыя акты, з улікам абставінаў справы і найлепшым чынам адказвае на патрэбы забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі і канстытуцыйнага правасуддзя;

1.5. калегіяльнасці, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае звароты калегіяльна пры наяўнасці заснаванага гэтым Арганічным законам кворуму і прымае рашэнні і іншыя акты ўстаноўленай гэтым Арганічным законам большасцю галасоў;

1.6. роўнасці суддзяў, у адпаведнасці з якім суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не падпарадкоўваюцца адзін аднаму і маюць роўныя правы пры разглядзе справаў і, у адпаведнасці з гэтым Арганічным законам, Старшыня Канстытуцыйнага Суда надзяляецца толькі дадатковымі адміністрацыйнымі паўнамоцтвамі, неабходнымі для арганізацыі працы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, а старшынствуючы на пасяджэнні — дадатковымі працэсуальнымі паўнамоцтвамі, неабходнымі для вядзення пасяджэння;

1.7. галоснасці і адкрытасці, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь аператыўна інфармуе грамадскасць аб сваёй дзейнасці (зваротах, прасоўванні ў іх разглядзе, пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, парадку дня, прынятых рашэннях ды іншых актах, актуальных падзеях міжнароднага супрацоўніцтва, грамадскіх мерапрыемствах Канстытуцыйнага Суда, ды іншыя знамянальныя падзеі) публікуе гадавыя справаздачы аб выніках дзейнасці, стварае ўмовы для грамадскасці для назірання за публічнымі пасяджэннямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, прымае меры па тлумачэнні для грамадскасці сутнасці рашэнняў ды іншых актаў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, вядзе дыялог з грамадзянскай супольнасцю;

1.8. недапушчэння канфліктаў інтарэсаў, у адпаведнасці з якім звароты і скаргі, якія паступілі на разгляд Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, размяркоўваюцца суддзям аўтаматычна, а суддзя, які мае дачыненне да любога з бакоў у справе канстытуцыйнай юстыцыі або публічна выказаў сваё меркаванне па сутнасці справы, павінен адхіліцца або быць адхілены ад разгляду адпаведна;

1.9. аператыўнасці, у адпаведнасці з якім Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь вырашае пытанні, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю, аператыўна і ў дакладных тэрмінах, прадугледжаных для іх разгляду гэтым Арганічным законам;

1.10. адсутнасці імунітэту ад канстытуцыйнага кантролю, у адпаведнасці з якім пры ажыццяўленні канстытуцыйных паўнамоцтваў Канстытуцыйным Судом ніводны прававы акт не можа карыстацца імунітэтам ад канстытуцыйнага кантролю;

1.11. паслядоўнага развіцця юрыспрудэнцыі, у адпаведнасці з якім рашэнні ды іншыя акты Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь павінны грунтавацца на папярэдніх рашэннях ды іншых актах, у прыватнасці паслядоўна развіваць афіцыйнае тлумачэнне Канстытуцыі (афіцыйную канстытуцыйную дактрыну), а істотныя змены афіцыйнага тлумачэння Канстытуцыі магчымыя толькі ў канстытуцыйна абгрунтаваных выпадках павышэння гарантый вяршэнства Канстытуцыі, умацавання асноваў плюралістычнай дэмакратыі і ўзроўню абароны правоў і свабод чалавека.

**Артыкул 5. Афіцыйныя атрыбуты**

1. Неад'емнымі атрыбутамі залы пасяджэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца дзяржаўны сцяг і дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь. Гэтыя дзяржаўныя сімвалы таксама выкарыстоўваюцца пры ўваходзе ў памяшканне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і ў выпадках, прадугледжаных законамі і рашэннямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь зацвярджае свой сцяг і эмблему, а таксама парадак іх выкарыстання.

**Артыкул 6. Месцазнаходжанне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь знаходзіцца ў горадзе Мінску.

2. Канкрэтнае месцазнаходжанне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь можа быць зменена толькі са згоды Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 7. Паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь па разглядзе справаў канстытуцыйнай юстыцыі**

1. Згодна з Канстытуцыяй, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае справы:

1.1. аб адпаведнасці Канстытуцыі прававых актаў Сойма, прэзідэнта, урада (згодна з падпунктам 1.1, 1.3 і 1.4 пункта 1 артыкула 128 Канстытуцыі);

1.2. аб адпаведнасці прадстаўленых на ратыфікацыю міжнародных дамоваў Канстытуцыі (згодна з падпунктам 1.2 пункта 1 артыкула 128 разам з пунктам 1 артыкула 82 Канстытуцыі);

1.3. аб парушэнні канстытуцыйных правоў і свабод фізічных і юрыдычных асоб (згодна з падпунктам 1.5 пункта 1 артыкула 128 Канстытуцыі);

1.4. аб імпічменце Прэзідэнта - аб зняцці Прэзідэнта з пасады пры парушэнні Прэзідэнтам Прысягі або ўчыненні ім злачынства (згодна з падпунктам 1.6 пункта 1 артыкула 128 разам з пунктам 4 артыкула 92 Канстытуцыі);

1.5. аб канстытуцыйнасці рашэння Сойма аб назначэнні датэрміновых выбараў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання (згодна з падпунктам 1.7 пункта 1 артыкула 128 разам з пунктам 1 артыкула 118 Канстытуцыі);

1.6. аб афіцыйным тлумачэнні нормаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія датычацца паўнамоцтваў канстытуцыйных органаў улады і мясцовага самакіравання (згодна з пунктам 2 артыкула 128 Канстытуцыі);

1.7. аб канстытуцыйнасці канстытуцыйных паправак (згодна з пунктам 2 артыкула 160 разам з пунктамі 1 і 2 артыкула 162 Канстытуцыі);

1.8. аб канстытуцыйнасці фармулёвак пытанняў, якія выносяцца на нацыянальны рэферэндум (згодна з пунктам 2 артыкула 66 Канстытуцыі).

**Артыкул 8. Акты Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні, вызначэнні і пастановы.

2. Рашэнні прымаюцца па сутнасці справы, якая разглядаецца, на закрытай частцы пленарнага пасяджэння не менш як 8 галасамі суддзяў, якія прымалі ўдзел у разглядзе справы, за выключэннем рашэння па справе аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады ў парадку пункта 4 артыкула 92 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, для прыняцця якога неабходна не менш за 10 галасоў суддзяў, якія прымалі ўдзел у разглядзе справы.

3. Вызначэнні прымаюцца па адкрыцці канстытуцыйнага судаводства і іншых працэсуальных пытаннях. Пастановы прымаюцца па ўсіх іншых пытаннях дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, у тым ліку арганізацыйных, калі іншае не прадугледжана гэтым Арганічным законам. Вызначэнні і пастановы прымаюцца простай большасцю галасоў суддзяў, якія прымаюць удзел у пасяджэнні.

## ГЛАВА 2. ФАРМАВАННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 9. Склад Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь складаецца з 15 суддзяў, якія прызначаюцца тэрмінам на 9 гадоў.

2. Паўторнае прызначэнне на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не дапускаецца.

3. Суддзя, паўнамоцтвы якога скончыліся, працягвае ажыццяўляць свае паўнамоцтвы да ўступлення на пасаду суддзі.

**Артыкул 10. Кваліфікацыйныя і іншыя патрабаванні да кандыдатаў на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Суддзёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь можа быць прызначаны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае бездакорную рэпутацыю, вышэйшую юрыдычную адукацыю, які валодае агульнапрызнанымі дасягненнямі ў сферы права і які прапрацаваў па юрыдычнай спецыяльнасці не менш за 15 гадоў.

2. Вышэйшай юрыдычнай адукацыяй для мэтаў гэтага Закона лічыцца адукацыя на ўзроўні не ніжэйшым за «магістр» («спецыяліст») па спецыяльнасці «права» (або «міжнароднае права»).

3. Пры вызначэнні стажу работы па юрыдычнай спецыяльнасці ўлічваецца перыяд работы на пасадах, кваліфікацыйныя патрабаванні да заняцця якіх прадугледжваюць наяўнасць вышэйшай юрыдычнай адукацыі, а таксама заняткі іншымі відамі індывідуальнай дзейнасці, ажыццяўленне якой магчымае толькі пры наяўнасці названай адукацыі.

4. Суддзёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не можа быць асоба, якая ўчыніла наўмыснае злачынства, калі судзімасць не знятая або не пагашаная ў зацверджаным законам парадку, якая ўчыніла карупцыйнае правапарушэнне ў перыяд пяці гадоў да намінавання на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, а таксама прызнаная такой, што не мае права знаходзіцца на дзяржаўнай службе, у адпаведнасці і ў парадку, зацверджаным Законам «Аб люстрацыі».

**Артыкул 11. Парадак прызначэння суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

Працэдура прызначэння суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь прадугледжвае стадыі: аб'яўленне конкурсу на замяшчэнне вакантнай пасады, намінаванне кандыдатаў, праверку маральных якасцяў і ўзровень прафесійнай кампетэнцыі, прыняцце рашэння аб прызначэнні на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і прывядзенне суддзі Канстытуцыйнага Суда да прысягі.

**Артыкул 12. Аб'ява конкурсу на замяшчэнне вакантнай пасады суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Аб'ява аб правядзенні конкурсу на замяшчэнне вакантнай пасады суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Сойму Рэспублікі Беларусь, Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь шляхам размяшчэння інфармацыі аб конкурсе на іх афіцыйных сайтах не пазней чым за тры месяцы да дня спынення тэрміну паўнамоцтваў або дасягнення гранічнага ўзросту знаходжання на пасадзе суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, або не пазней чым праз адзін месяц з дня спынення яго паўнамоцтваў па іншых падставах, прадугледжаных гэтым Арганічным законам.

2. На працягу аднаго месяца з дня аб'яўлення конкурсу кожны, хто адпавядае крытэрам, прадугледжаным артыкулам 10 гэтага Арганічнага закона, мае права падаць заяву аб удзеле ў конкурсе ў парадку, які вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Старшынёй Сойму Рэспублікі Беларусь, Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь адпаведна.

3. Да заявы аб удзеле прыкладаюцца:

3.1. дакументы аб вышэйшай юрыдычнай адукацыі;

3.2. дакументы аб наяўнасці стажу па юрыдычнай спецыяльнасці;

3.3. дакумент аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь;

3.4. аўтабіяграфія;

3.5. дэкларацыя аб маёмасным становішчы і даходзе кандыдата і чальцоў яго сям'і за папярэдні год;

3.6. іншыя дакументы па меркаванні кандыдата, якія сведчаць аб дастатковай кампетэнцыі для займання пасады суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 13. Намінаванне кандыдатаў**

1. Намінаванне кандыдатаў у суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Старшынёй Сойму Рэспублікі Беларусь і Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (далей - суб'ектамі намінавання) шляхам прадстаўлення кандыдатаў на разгляд Экспертнай камісіі ў колькасці не менш як двух кандыдатаў на адну вакантную пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак адбору кандыдатаў для прадстаўлення на разгляд Экспертнай камісіяй вызначаецца адпаведным палажэннем, якое зацвярджаецца кожным з суб'ектаў намінавання, указаным у частцы першай гэтага артыкула.

**Артыкул 14. Экспертная камісія**

1. Для праверкі маральных якасцяў кандыдатаў і ўзроўню іх прафесійнай кампетэнцыі ствараецца Экспертная камісія.

2. Экспертная камісія складаецца з 6 чальцоў. У склад камісіі па адным чальцу з ліку юрыстаў з бездакорнай рэпутацыяй прызначаюць:

2.1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

2.2. Старшыня Сойму Рэспублікі Беларусь;

2.3. Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Урад Рэспублікі Беларусь прызначае трох чальцоў камісіі па прадстаўленні Еўрапейскай камісіі «За дэмакратыю праз права», Старшыні Еўрапейскага суда па правах чалавека і Камітэта ААН па правах чалавека.

4. Тэрмін паўнамоцтваў чальцоў Экспертнай камісіі складае 3 гады з моманту прызначэння. Экспертная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць на грамадскіх пачатках.

5. Арганізацыйнае і матэрыяльнае забеспячэнне дзейнасці Экспертнай камісіі ажыццяўляецца Канцылярыяй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Працэдура правядзення конкурснага адбору Экспертнай камісіяй**

1. Працэдура праверкі і адбору кандыдатаў Экспертнай камісіяй уключае ў сябе праверку адпаведнасці кандыдатаў крытэрам добрапрыстойнасці, зацверджаных для дзяржаўных службоўцаў, а таксама адпаведнасці ўзроўню прафесійнай кампетэнцыі кандыдата задачам і функцыям Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Пералік кандыдатаў, пададзеных на разгляд Экспертнай камісіі, падлягае абнародаванню на сайце адпаведнага суб'екта намінавання.

3. З мэтай праверкі кандыдатаў і правядзення конкурснага адбору чальцы Экспертнай камісіі маюць права запатрабаваць неабходную інфармацыю і/або дакументы, звяртацца з запытамі да органаў аховы правапарадку адносна фактаў, якія датычацца кандыдатаў.

4. Асноўнай формай вызначэння Экспертнай камісіяй адпаведнасці кандыдатаў пасады суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь з'яўляецца сумоўе з кандыдатам, якое праводзіцца галосна шляхам трансляцыі на вэб-рэсурсах.

5. Працэдурныя пытанні правядзення конкурснага адбору вызначаюцца палажэннем, якое зацвярджаецца Экспертнай камісіяй.

6. Экспертная камісія фармуе спіс кандыдатаў, якія адпавядаюць патрабаванням да суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, у рэйтынгавым парадку.

7. Рашэнні конкурснай камісіі афармляюцца пратаколам і публікуюцца на афіцыйным вэб-сайце Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

8. У выпадку немагчымасці адабраць дастатковую колькасць кандыдатаў, прадугледжаную пунктам 6 гэтага артыкула, суб'ект намінавання па сваім меркаванні дадаткова вылучае кандыдатаў на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

9. Калі на працягу двух месяцаў з моманту аб'яўлення конкурсу адзін або больш суб’ектаў намінавання не змогуць запоўніць свае вакансіі, камісія мае права прапанаваць падаваць заявы ўсім ахвочым, адпаведным крытэрам адбору.

**Артыкул 16. Прыняцце рашэння аб прызначэнні на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. На падставе прадстаўлення суб'ектаў намінавання Сойм Рэспублікі Беларусь прымае рашэнне аб прызначэнні на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь шляхам таемнага галасавання большасцю ад канстытуцыйнага складу Сойма.

2. Парадак разгляду пытання аб прызначэнні на пасаду суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь вызначаецца Рэгламентам Сойму.

**Артыкул 17. Прывядзенне суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь да прысягі**

1. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь уступае ў паўнамоцтвы пасля прыняцця прысягі такога зместу: «Я, (імя, прозвішча), клянуся быць верным Рэспубліцы Беларусь, добрасумленна выконваць абавязкі суддзі Канстытуцыйнага Суда, абараняць канстытуцыйны лад незалежнай Беларусі і адстойваць вяршэнства Канстытуцыі, падпарадкоўваючыся толькі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь».

2. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь прыводзіцца да прысягі на пленарным пасяджэнні Сойма неадкладна пасля яго прызначэння на пасаду.

## ГЛАВА 3. СТАТУС СУДДЗІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 18. Дзейнасць, несумяшчальная з пасадай суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Пасада суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь несумяшчальная з дэпутацкім мандатам, ажыццяўленнем адвакацкай або прадпрымальніцкай дзейнасці, уваходжаннем у склад кіраўнічага органа або наглядальнай рады юрыдычнай асобы, якая мае на мэце атрыманне прыбытку, з заняццем іншых аплатных пасад, акрамя выкладчыцкай, навуковай або творчай.

2. Асоба, якая з’яўляецца ўласнікам акцый або валодае іншымі карпаратыўнымі правамі, або мае іншыя маёмасныя інтарэсы ў дзейнасці якой-небудзь юрыдычнай асобы, што мае на мэце атрыманне прыбытку, на час знаходжання на пасадзе суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь абавязана перадаць такія акцыі (карпаратыўныя або іншыя адпаведныя правы) ў даверыцевае кіраванне трэцім асобам без права дачы імі даручэнняў адносна распараджэння гэтымі правамі. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь можа атрымліваць адсоткі, дывідэнды ды іншыя пасіўныя даходы ад маёмасці, уласнікам якой ён з’яўляецца.

3. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не павінен удзельнічаць у палітычных партыях, прафесійных саюзах, выступаць у падтрымку якіх-кольвек палітычных партый. У выпадку, калі на момант прызначэння на пасаду суддзя з'яўляецца чальцом палітычнай партыі або прафесійнага саюза, ён абавязаны спыніць сваё сяброўства ў іх на працягу дзесяці дзён з моманту ўступлення ў пасаду.

**Артыкул 19. Гарантыі незалежнасці суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

Незалежнасць суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь забяспечваецца яго нязменнасцю, недатыкальнасцю, роўнасцю правоў суддзяў, устаноўленым гэтым Арганічным законам парадкам прыпынення і спынення паўнамоцтваў, правам на адстаўку, забаронай якой-кольвек формы ўмяшання ў судовую дзейнасць, прадастаўленнем суддзі матэрыяльнага і сацыяльнага забеспячэння, якое адпавядае яго высокаму статусу.

**Артыкул 20. Незмяняльнасць суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Паўнамоцтвы суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не могуць быць спыненыя або прыпыненыя інакш, як у парадку і на падставе, устаноўленымі Канстытуцыяй, і ў парадку, прадугледжаным гэтым Арганічным законам.

2. Паўнамоцтвы суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь спыняюцца ў выпадках:

2.1. падачы заявы аб вызваленні ад пасады па ўласным жаданні;

2.2. прызначэння (абрання) на іншую пасаду або пераводу на іншую працу з яго згоды;

2.3. заканчэння тэрміну паўнамоцтваў;

2.4. дасягнення ўзросту 70 гадоў;

2.5. спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

2.6. прызнання суддзі не здольным па стане здароўя выконваць абавязкі суддзі, уступлення ў законную сілу рашэння суда аб прызнанні суддзі абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным;

2.7. заняцця дзейнасцю, несумяшчальнай з пасадай суддзі;

2.8. уступлення ў законную сілу абвінаваўчага прысуду ў адносінах да суддзі за ўчыненне злачынства;

2.9. смерці, аб'яўлення памерлым (ай) або прызнання без вестак адсутным (ай) рашэннем суда, які ўступіў у законную сілу;

2.10. парушэнне абавязку пацвердзіць законнасць крыніцы паходжання маёмасці, якая падлягае дэклараванню.

3. Акрамя выпадкаў спынення паўнамоцтваў па падставах, прадугледжаных падпунктамі 2.3, 2.9. паўнамоцтвы суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь спыняюцца пастановай Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, прынятай простай большасцю галасоў ад агульнай колькасці суддзяў.

4. паўнамоцтвы суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь прыпыняюцца пастановай Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, прынятай простай большасцю галасоў ад агульнай колькасці суддзяў у выпадках:

4.1. затрымання на месцы ўчынення злачынства;

4.2. калі у парадку, прадугледжаным гэтым Арганічным законам, дадзена згода на прыцягненне суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь да крымінальнай адказнасці;

5. Пасля знікнення падставы прыпынення паўнамоцтваў суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь не пазней як на працягу 3 дзён прымае рашэнне аб аднаўленні паўнамоцтваў суддзі.

**Артыкул 21. Недатыкальнасць суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь на працягу тэрміну сваіх паўнамоцтваў не можа быць затрыманы, падвергнуты ўтрыманню пад вартай, дамашняму арышту, прываду, мерам адміністрацыйнага спагнання, якія накладаюцца ў судовым парадку, прыцягнуты да крымінальнай адказнасці без згоды Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадку, калі ён заспеты на месцы ўчынення цяжкага або асабліва цяжкага злачынства.

2. Пытанне аб згодзе на прыцягненне суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь да крымінальнай адказнасці разглядаецца па прадстаўленні Генеральнага пракурора. Нагляд за выкананнем законнасці ў ходзе расследавання справы ажыццяўляецца Генеральным Пракурорам.

3. У дачыненні да суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь за невыкананне прадугледжаных гэтым Арганічным законам абавязкаў без уважлівай прычыны рашэннем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, прынятай простай большасцю ад агульнай колькасці суддзяў, могуць прымяняцца матэрыяльныя санкцыі – памяншэнне ўзнагароджання ў памеры да 50 % за месяц, у якім мела месца невыкананне абавязкаў.

4. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не можа быць прыцягнуты да адказнасці, у тым ліку пасля спынення яго паўнамоцтваў, за пазіцыю, выказаную ім пры разглядзе справы ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 22. Роўнасць правоў суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

Суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь валодаюць роўнымі правамі пры разглядзе справаў, якія знаходзяцца ў вытворчасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, і пры прыняцці па іх рашэнняў.

**Артыкул 23. Гарантыі матэрыяльнага і сацыяльнага забеспячэння суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Зарабак суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь вызначаецца зыходзячы з заробку суддзі Вярхоўнага Суда з надбаўкай у памеры 30 адсоткаў.

2. Заробак Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь вызначаецца зыходзячы з заробку Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь з надбаўкай 30 адсоткаў (для намесніка Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь - 15 адсоткаў).

3. Суддзям Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь прадастаўляецца штогадовы адпачынак працягласцю сорак пяць каляндарных дзён.

4. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, які не мае жылога памяшкання ў Мінску, мае права на кампенсацыю арэнднай платы за жылое памяшканне у парадку, устаноўленым Нацыянальнай Радай правасуддзя.

5. Па заканчэнні тэрміну паўнамоцтваў суддзі павінна прадастаўляцца ранейшая праца ці пасада ў дзяржаўных установах, а пры адсутнасці такіх магчымасцяў - іншая раўнацэнная праца ці пасада.

6. Суддзям Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь або дасягненні гранічнага ўзросту назначаецца пажыццёвая штомесячная дапамога, памер якой складае 70 адсоткаў службовага акладу суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

# РАЗДЗЕЛ II. СТРУКТУРА І АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ГЛАВА 4. АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 24. Арганізацыя працы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь рэалізуе свае паўнамоцтвы, прадугледжаныя артыкулам 7 як калегіяльны орган шляхам прыняцця рашэнняў на сваіх пленарных пасяджэннях.

2. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з'яўляецца правамоцным для ажыццяўлення сваёй юрысдыкцыі пры наяўнасці не менш як 10 суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Для вырашэння пытання аб адкрыцці вядзення па канстытуцыйных зваротах (скаргах) Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь са свайго складу стварае калегіі суддзяў. Калегія можа складацца не менш як з трох суддзяў.

4. Для падрыхтоўкі і папярэдняга абмеркавання арганізацыйных пытанняў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь можа ствараць са свайго складу камісіі.

5. Парадак арганізацыі і дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго працоўных органаў вызначаюцца гэтым Арганічным законам і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 25. Рэгламент Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Рэгламент Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь вызначае пытанні арганізацыі і дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, арганізацыю працы Канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пытанняў, урэгуляваных гэтым Арганічным законам.

2. Рэгламент прымаецца на аснове і ў мэтах выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і гэтага Арганічнага закона.

3. Рэгламент зацвярджаецца на пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Рашэнне аб зацвярджэнні Рэгламенту, а таксама ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у яго прымаецца не менш як 10 суддзямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 26. Арганізацыйныя формы дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні аб адкрыцці вытворчасці, адмове ў адкрыцці вытворчасці, спыненні вытворчасці, разглядае канстытуцыйныя звароты (скаргі) па сутнасці на сваіх пленарных пасяджэннях.

2. Пленарнае пасяджэнне з'яўляецца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел не менш як 10 суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Арганізацыйныя ды іншыя пытанні, не звязаныя з ажыццяўленнем юрысдыкцыі Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь, разглядаюцца і вырашаюцца на пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

4. Пасяджэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь з'яўляецца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел не менш як 8 суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым Арганічным законам.

## ГЛАВА 5. АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 27. Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго намеснік**

1. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь выбірае са свайго складу Старшыню Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь тэрмінам на 5 гадоў або да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў, без магчымасці перавыбрання.

2. Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь выбіраецца на пасяджэнні шляхам таемнага галасавання суддзямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Пасяджэнне па выбранні старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь з'яўляецца правамоцным пры ўдзеле ў ім не менш як 10 суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

4. Кандыдатуры на пасаду Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь могуць вылучацца суддзямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. У бюлетэнь уключаюцца ўсе вылучаныя кандыдаты ў алфавітным парадку.

5. Выбраным лічыцца кандыдат, які набраў большасць адносна іншых кандыдатаў галасоў суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, але не менш за 8 суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

6. У выпадку, калі ніводзін з кандыдатаў не набраў неабходнай колькасці галасоў, праводзіцца паўторнае галасаванне, пры якім у бюлетэнь для галасавання ўключаюцца два кандыдаты, якія набралі найбольшую колькасць галасоў.

7. У выпадку неабрання старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь па выніках паўторнага галасавання праводзяцца новыя выбары.

8. Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь:

8.1. склікае і старшынюе на пленарных пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.2. на падставе рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь зацвярджае парадак дня пленарных пасяджэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.3. прапануе на разгляд Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь:

8.3.1. праект Рэгламенту Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.3.2. кандыдатуру кіраўніка канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.3.3. праект штатнага раскладу канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.3.4. праект палажэння аб канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.3.5. праект бюджэту Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

8.4. прадстаўляе Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь ва ўзаемаадносінах з органамі дзяржаўнай улады, іх службовымі асобамі, аб'яднаннямі грамадзян, асобнымі грамадзянамі, сродкамі масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь, іншых дзяржаваў, міжнароднымі арганізацыямі ды асацыяцыямі;

8.5. у выкананне паўнамоцтваў, прадугледжаных гэтым Арганічным законам і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, выдае загады;

8.6. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Арганічным законам і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

9. Па прапанове Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь абірае намесніка Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

10. Пры абранні намесніка Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь кіруецца правіламі гэтага артыкула.

11. Намеснік Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь:

11.1. замяшчае Старшыню Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у выпадку яго адсутнасці або немагчымасці ажыццяўлення ім паўнамоцтваў;

11.2. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, вызначаныя Старшынёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у межах, зацверджаных гэтым Арганічным законам і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

12. У выпадку адсутнасці Старшыні і намесніка Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь або немагчымасці ажыццяўлення імі паўнамоцтваў, абавязкі Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ускладаюцца на старэйшага па ўзросце з суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 28. Канцылярыя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Для забеспячэння дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у яго складзе дзейнічае Канцылярыя.

2. Канцылярыя:

2.1. забяспечвае падрыхтоўку і правядзенне пасяджэнняў калегій, пасяджэнняў і пленарных пасяджэнняў Канстытуцыйнага Суда;

2.2. забяспечвае дзейнасць Старшыні Канстытуцыйнага Суда, намесніка Старшыні Канстытуцыйнага Суда, сакратароў калегій, суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

2.3. забяспечвае афіцыйнае абнародаванне актаў Канстытуцыйнага Суда;

2.4. ажыццяўляе рэгістрацыю і папярэднюю праверку ўсіх формаў зваротаў, якія паступілі ў Канстытуцыйны Суд, рыхтуе папярэднія вывады аб наяўнасці падстаў для адкрыцця канстытуцыйнай вытворчасці па справе або адмовы ў адкрыцці канстытуцыйнай вытворчасці;

2.5. забяспечвае дзейнасць Навукова-кансультатыўнай рады Канстытуцыйнага Суда;

2.6. ажыццяўляе бюджэтаванне дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

2.7. забяспечвае рэдакцыйна-выдавецкую дзейнасць Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

2.8. выконвае іншыя задачы, прадугледжаныя гэтым Арганічным законам і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Канцылярыю ўзначальвае кіраўнік Канцылярыі, якога Канстытуцыйны Суд прызначае на пасаду і вызваляе ад пасады па прадстаўленні Старшыні Канстытуцыйнага Суда.

4. У складзе Канцылярыі дзейнічае Бібліятэка, Архіў, Рэдакцыя выданняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

5. Палажэнне аб Канцылярыі і яе штатным раскладзе зацвярджае Канстытуцыйны Суд па прадстаўленні Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 29. Навукова-кансультацыйная рада Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Для аказання навукова-метадалагічнага садзейнічання дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ствараецца навукова-кансультацыйная рада, персанальны склад і палажэнне аб якім зацвярджае Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь на сваім пасяджэнні.

2. Чальцы навукова-кансультацыйнай рады ажыццяўляюць сваю дзейнасць на грамадскіх пачатках. Дапускаецца выдзяленне сродкаў, прадугледжаных на фінансаванне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, для пакрыцця расходаў, звязаных з аказаннем чальцамі навукова-кансультацыйнай рады экспертных паслуг.

# РАЗДЗЕЛ III. КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ СУДАВОДСТВА

## ГЛАВА 6. ЗВАРОТ У КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І АДКРЫЦЦЁ СУДАВОДСТВА

**Артыкул 30. Зварот у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь**

1. Падставай для разгляду пытання аб адпаведнасці Канстытуцыі прававых актаў Сойма, Прэзідэнта і Урада з'яўляецца зварот Прэзідэнта, Урада, не менш за адну пятую ад канстытуцыйнага складу Сойма.

2. Падставай для разгляду пытання аб адпаведнасці міжнародных дамоваў, пададзеных на ратыфікацыю Сойма, з'яўляецца зварот Прэзідэнта, Урада, не менш за адну пятую ад канстытуцыйнага складу Сойма.

3. Падставай для разгляду пытання аб адпаведнасці праекта Канстытуцыйнага закона аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь патрабаванням артыкула 162 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца зварот Сойма Рэспублікі Беларусь.

4. На падставе звароту суда Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае пытанне аб канстытуцыйнасці прававых актаў Сойма, Прэзідэнта і Урада, якія падлягаюць прымяненню судом пры разглядзе канкрэтных справаў.

5. На падставе звароту Сойма Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае пытанне аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады за парушэнне ім прысягі або ўчыненне ім злачынства, а таксама пытанне аб адпаведнасці Канстытуцыі рашэння Сойма аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання.

6. На падставе звароту Сойма, Прэзідэнта, Урада, Нацыянальнай рады правасуддзя, Праўлення Нацыянальнага банка, Цэнтральнай выбарчай камісіі, Упаўнаважанага па правах чалавека, Кантрольнай палаты, Камітэта па наглядзе за дзейнасцю службаў разведкі і бяспекі, Камітэта па этыцы дзяржаўнай службы і процідзеяння карупцыі, органа мясцовага самакіравання Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае спрэчкі, якія датычацца паўнамоцтваў адпаведных органаў.

7. Асаблівай формай звароту ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з'яўляецца канстытуцыйная скарга, якая падаецца фізічнай або юрыдычнай асобай.

**Артыкул 31. Патрабаванні да звароту ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь**

1. Зварот, прадугледжаныя пунктамі 1, 4 артыкула 30 гэтага Закона, з'яўляецца прымальным пры выкананні наступных патрабаванняў:

1.1.У звароце пазначаны:

1.1.1 суб'ект звароту;

1.1.2. прававы акт (або яго часткі, артыкулы і г.д.), канстытуцыйнасць якога аспрэчваецца перад Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь;

1.1.3. нормы Канстытуцыі, адпаведнасць якім артыкулаў (акта), просіць праверыць суб'ект звароту;

1.1.4. аргументацыя неканстытуцыйнасці пазначанага акта;

1.1.5. асоба (асобы), упаўнаважаныя суб'ектам звароту прадстаўляць яго інтарэсы пры разглядзе звароту.

1.2. зварот падпісаны належным суб'ектам звароту;

1.3. да звароту прыкладаюцца нарматыўныя акты, канстытуцыйнасць нормаў якіх аспрэчваецца ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, а таксама неабходныя дакументы аб паўнамоцтвах прадстаўнікоў суб'екта звароту.

2. Зварот, прадугледжаны пунктам 2 артыкула 30 гэтага Закона, з'яўляецца прымальным пры выкананні наступных патрабаванняў:

2.1. у звароце пазначаныя:

2.1.1 суб'ект звароту;

2.1.2. нормы Канстытуцыі, адпаведнасць якім палажэнняў міжнароднай дамовы, якая падаецца на ратыфікацыю, просіць праверыць суб'ект звароту;

2.1.3. аргументацыя неканстытуцыйнасці пазначаных артыкулаў (акта);

2.1.4. асоба (асобы), упаўнаважаныя суб'ектам звароту прадстаўляць яго інтарэсы пры разглядзе звароту;

2.2. зварот падпісаны належным суб'ектам звароту;

2.3. Да звароту прыкладаюцца тэкст міжнароднай дамовы, адпаведнасць якой Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь просіць праверыць суб'ект звароту, а таксама неабходныя дакументы аб паўнамоцтвах прадстаўнікоў суб'екта звароту.

3. Зварот Сойма, прадугледжаны пунктам 5 артыкула 30 гэтага Закона (у частцы адхілення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад пасады), з'яўляецца дастатковай падставай для адкрыцця вытворчасці, у выпадку адпаведнасці звароту такім патрабаванням:

3.1. зварот зацверджаны пастановай Сойма;

3.2. у звароце вычарпальна выкладзеныя фактычныя абставіны, якія паслужылі падставай для прад'яўлення Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь абвінавачання ў парушэнні прысягі або ўчыненні злачынства;

3.3. у звароце апісанае захаванне працэдур, прадугледжаных Рэгламентам Сойма, для прад’яўлення Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь абвінавачання ў парушэнні прысягі ці ўчынення злачынства;

3.4. у звароце пазначаныя дэпутаты Сойма, упаўнаважаныя прадстаўляць інтарэсы Сойма пры разглядзе яго звароту;

3.5. да звароту прыкладаюцца ўсе неабходныя дакументы і матэрыялы, якія датычацца патрабаванняў падпунктаў 3.2-3.4 гэтай часткі артыкула 31.

4. Зварот Сойма, прадугледжаны пунктам 5 артыкула 30 гэтага Закона (у частцы прыняцця рашэння Сойма аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання), з'яўляецца дастатковай падставай для адкрыцця вытворчасці, у выпадку адпаведнасці звароту такім патрабаванням:

4.1. зварот зацверджаны пастановай Сойма;

4.2. у звароце вычарпальна выкладзеныя фактычныя абставіны, якія паслужылі падставай для прыняцця рашэння Сойма аб датэрміновых выбарах прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання;

4.3. у звароце пазначаныя дэпутаты Сойма, упаўнаважаныя прадстаўляць інтарэсы Сойма пры разглядзе яго звароту;

4.4. да звароту прыкладаюцца ўсе неабходныя дакументы і матэрыялы, якія датычацца патрабаванняў падпункта 4.2. гэтага артыкула.

5. Зварот, прадугледжаны пунктам 6 артыкула 30 гэтага Закона, з'яўляецца прымальным пры выкананні наступных патрабаванняў:

5.1. у звароце пазначаны:

5.1.1 суб'ект звароту;

5.1.2. нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць паўнамоцтвы адпаведных органаў улады або службовых асоб, афіцыйнае тлумачэнне якіх суб'ект звароту просіць даць Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь;

5.1.3 абгрунтаванне практычнай неабходнасці афіцыйнага тлумачэння адпаведных нормаў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

5.1.4 асоба (асобы), упаўнаважаныя суб'ектам звароту, прадстаўляць яго інтарэсы пры разглядзе звароту;

5.2. зварот падпісаны належным суб'ектам звароту;

5.3. да звароту прыкладаюцца неабходныя дакументы і матэрыялы, якія датычацца падпункта 5.1. гэтага артыкула.

6. Зварот Сойма, прадугледжаны пунктам 3 артыкула 30 гэтага Закона, з'яўляецца дастатковай падставай для адкрыцця вытворчасці, у выпадку адпаведнасці звароту такім патрабаванням:

6.1. зварот зацверджаны пастановай Сойма;

6.2. да звароту прыкладаецца праект Канстытуцыйнага закона аб змяненні і (або) дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

6.3. у звароце пазначаныя дэпутаты Сойма, упаўнаважаныя прадстаўляць інтарэсы Сойма пры разглядзе гэтага звароту.

7. Канстытуцыйная скарга, прадугледжаная пунктам 7 артыкула 30 гэтага Закона, з'яўляецца прымальнай пры выкананні наступных патрабаванняў:

7.1. у скарзе пазначаныя:

7.1.1. прозвішча, імя, імя па бацьку (пры наяўнасці), ідэнтыфікацыйны нумар, месца жыхарства, а таксама адрас электроннай пошты, нумар тэлефона (пры наяўнасці) асобы, якая падае заяву; імя, прозвішча і адрас, а таксама адрас электроннай пошты і нумар тэлефона прадстаўніка (пры яго наяўнасці);

7.1.2. рэквізіты акта органа дзяржаўнай улады (судовага рашэння), якім на думку заяўніка ўшчамляюцца яго канстытуцыйныя правы і свабоды;

7.1.3. нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць і гарантуюць канстытуцыйныя правы і свабоды, якім (нормам) на думку заяўніка, не адпавядае нарматыўны акт, які аспрэчваецца ў скарзе, з дастатковым абгрунтаваннем такой неадпаведнасці;

7.1.4. сродкі прававой абароны, выкарыстаныя заяўнікам, для абароны сваіх канстытуцыйных правоў і свабод, прыніжаных нарматыўным актам, які аспрэчваецца ў скарзе;

7.1.5. звесткі аб прадстаўніку заяўніка пры разглядзе скаргі (у выпадку прадстаўлення інтарэсаў заяўніка па законе або даверанасці);

7.2. перад падачай скаргі заяўнікам вычарпаныя сродкі судовай абароны сваіх канстытуцыйных правоў і свабод, прадугледжаныя Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь;

7.3. скарга пададзеная не пазней за 90 дзён з моманту ўступлення ў законную сілу канчатковага рашэння суда ў дачыненні да спрэчкі аб абароне канстытуцыйных правоў і свабод заяўніка. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь мае права аднавіць прапушчаны тэрмін для падачы скаргі на падставе выкладзеных у скарзе довадаў заяўніка аб аб'ектыўнай немагчымасці падачы скаргі ў тэрмін, указаны ў папярэднім абзацы, і хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну, якое змяшчаецца ў скарзе;

7.4. да скаргі прыкладзеныя ўсе неабходныя дакументы і матэрыялы, якія паказваюць на ўшчамленне яго канстытуцыйных правоў і свабод нарматыўным актам, а таксама вычарпанні ўсіх судовых сродкаў абароны сваіх канстытуцыйных правоў і свабод;

7.5. у выпадку прадстаўлення інтарэсаў заяўніка па законе або па даверанасці да скаргі прыкладаюцца дакументы, якія сведчаць паўнамоцтвы прадстаўніка.

8. Звароты (уключаючна з прыкладзенымі да іх матэрыяламі) падаюцца ў пісьмовай форме і падпісваюцца заяўнікам (або ўпаўнаважанай ім асобай).

9. У выпадку падачы звароту ад калегіяльнага органа ўлады падача звароту афармляецца шляхам прыняцця акта заяўнікам з дадаткам да ўказанага акта тэксту звароту.

10. Пры падачы звароту дэпутатамі Сойма, у выпадках, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 артыкула 30 гэтага Закона, звароты падпісваюцца ўпаўнаважанымі ім асобамі (упаўнаважанай асобай). Да звароту прыкладаецца пералік дэпутатаў Сойма, якія падаюць зварот, з іх подпісамі, заверанымі Апаратам Сойма.

11. Канстытуцыйная скарга можа быць пададзеная шляхам выкарыстання электронных сродкаў сувязі або шляхам запаўнення электроннай формы на афіцыйным сайце Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. У гэтым выпадку скарга падпісваецца электронным лічбавым подпісам заяўніка або ўпаўнаважаным ім асобы.

**Артыкул 32. Адкрыццё вытворчасці па звароце**

1. Атрыманае на разгляд Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, апрацаванае на адпаведнасць фармальным патрабаванням гэтага Закона Канцылярыяй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, на працягу 10 дзён з даты паступлення звароту перадаецца з выкарыстаннем сістэмы аўтаматычнага размеркавання зваротаў суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, які вызначаецца суддзёй-дакладчыкам па гэтым звароце.

2. Суддзя-дакладчык на працягу 14 дзён ажыццяўляе падрыхтоўчыя дзеянні, неабходныя для прыняцця рашэння аб адкрыцці вядзення па справе. З гэтай мэтай ён мае права:

2.1. запатрабаваць у заяўніка, органаў улады, іх службовых асоб, іншых юрыдычных асоб і грамадзян дакументы і матэрыялы, іншую інфармацыю, якая мае дачыненне да справы;

2.2. даваць даручэнні адпаведным падраздзяленням Канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

2.3. прыцягваць спецыялістаў для кансультацый;

2.4. ажыццяўляць іншыя паўнамоцтвы, вызначаныя гэтым Арганічным законам і Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Калегія суддзяў, у склад якой уваходзіць суддзя-дакладчык, па хадайніцтве суддзі-дакладчыка аб разглядзе пытання аб адкрыцці вытворчасці па звароце, на працягу 30 дзён па заканчэнні тэрміну, указанага ў абзацы першым часткі 2 гэтага артыкула, на падставе прадстаўленага даклада і вывучэнні сабраных матэрыялаў прымае рашэнне аб адкрыцці вытворчасці па звароце або аб адмове ў адкрыцці вытворчасці па звароце.

4. Рашэнне прымаецца большасцю чальцоў калегіі ад яе спісачнага складу, пры ўмове, што ў склад калегіі ўваходзіць не менш як 5 суддзяў. У іншым выпадку рашэнне прымаецца большасцю чальцоў калегіі, але не менш як 3 суддзі.

5. Рашэнне аб адмове ў адкрыцці вытворчасці па звароце абскарджанню не падлягае.

**Артыкул 33. Адмова ў адкрыцці вытворчасці па звароце. Пакіданне звароту без разгляду**

1. Калегія Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь прымае рашэнне аб адмове ў адкрыцці вытворчасці па звароце ў выпадку, калі:

1.1. зварот пададзены ўстановай або асобай, якая не мае права на зварот у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь;

1.2. разгляд звароту не аднесены да кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

1.3. канстытуцыйнасць нарматыўнага акта, указанага ў звароце, ужо праверана Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь і рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь па гэтым пытанні застаецца ў сіле;

1.4. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь ужо пачаў разгляд справы па тым жа пытанні;

1.5. зварот не адпавядае патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 31 гэтага Закона.

2. Рашэнне аб адмове ў адкрыцці вытворчасці па звароце накіроўваецца заяўніку на працягу 5 дзён з моманту яго пастановы.

3. У выпадку неадпаведнасці звароту фармальным патрабаванням, указаным у артыкуле 31 гэтага Закона, такі зварот застаецца без разгляду на падставе заключэння Канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Старшынёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

4. Не з'яўляецца падставай для адмовы ў адкрыцці вытворчасці (спынення вытворчасці) страта юрыдычнай сілы падспрэчным актам пры звароце з канстытуцыйнай скаргай (або звароту суда), а таксама ў выпадку, калі праверка канстытуцыйнасці такога акта служыць грамадскаму інтарэсу, абароне правоў чалавека і развіццю прававой сістэмы.

5. У заключэнні ўказваюцца факты неадпаведнасці звароту фармальным патрабаванням, указаным у артыкуле 31 гэтага Закона.

6. Аб прынятым рашэнні на працягу 3 дзён паведамляецца заяўнік. Заяўнік мае права на паўторны зварот у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь пасля прывядзення звароту ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Закона.

**Артыкул 34. Забеспячальныя меры**

1. У выпадку прыняцця рашэння аб адкрыцці вытворчасці па звароце Калегія суддзяў пры наяўнасці абгрунтаваных падставаў лічыць, што нарматыўны акт, канстытуцыйнасць якога аспрэчваецца ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, у далейшым можа нанесці непапраўную шкоду або стаць прычынай парушэнняў, якія не могуць быць кампенсаваныя або адноўленыя, прымае рашэнне аб прыпыненні дзеяння такога акта (выканання судовага рашэння).

2. Указанае рашэнне прымаецца калегіяй суддзяў па ўласнай ініцыятыве або па хадайніцтве заяўніка. Такое рашэнне падлягае неадкладнаму абнародаванню ў парадку, вызначаным гэтым Арганічным законам для абнародавання актаў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, і накіроўваецца для выканання органу ўлады або службовай асобе, якая выдала (прыняла) гэты акт.

3. Пры разглядзе канстытуцыйнай скаргі Калегія суддзяў па ўласнай ініцыятыве або хадайніцтве заяўніка мае права, пры адкрыцці вытворчасці па скарзе, прыпыніць выкананне судовага рашэння, прынятага на падставе нарматыўнага акта, канстытуцыйнасць якога аспрэчваецца ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

4. Падставай для прыняцця такога рашэння з'яўляецца неабходнасць прадухілення незваротных наступстваў, якія могуць узнікнуць у сувязі з выкананнем рашэння суда, якое ўступіла ў законную сілу.

5. Рашэнне калегіі суддзяў аб прыпыненні выканання судовага рашэння неадкладна накіроўваецца ў органы дзяржаўнай улады, якія забяспечваюць выкананне судовых рашэнняў. Копія рашэння накіроўваецца заяўніку.

## ГЛАВА 7. ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ

**Артыкул 35. Формы канстытуцыйнай вытворчасці**

1. Справы, канстытуцыйная вытворчасць па якіх адкрыта, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае ў парадку пісьмовай або вуснай вытворчасці.

2. Асноўнай формай разгляду спраў у Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь з'яўляецца пісьмовая вытворчасць. Форму вытворчасці вызначае Канстытуцыйны Суд.

3. Па справе, якая разглядаецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь у парадку пісьмовай вытворчасці, асобныя пытанні могуць разглядацца ў парадку вуснай вытворчасці.

**Артыкул 36. Пленарныя пасяджэнні**

1. Разгляд справаў, па якіх адкрыта вусная вытворчасць, ажыццяўляецца на пленарных пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак правядзення пленарных пасяджэнняў вызначаецца гэтым Арганічным законам і Рэгламентам.

3. На пленарных пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь старшынюе Старшыня Канстытуцыйнага Суда або намеснік Старшыні Канстытуцыйнага Суда, а ў выпадку іх адсутнасці - старшы па ўзросце суддзя.

4. У Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь звароты па сутнасці разглядаюцца ў адкрытых пасяджэннях.

5. Па ініцыятыве Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь або хадайніцтве бакоў пленарнае пасяджэнне або яго частка ў мэтах захавання камерцыйнай, дзяржаўнай таямніцы або іншай канфідэнцыйнай інфармацыі можа быць закрытым.

6. На закрытым пасяджэнні ў выпадку неабходнасці могуць прысутнічаць сведкі, эксперты і перакладчыкі. Па хадайніцтве бакоў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь можа прадаставіць права прысутнічаць на закрытым пасяджэнні і іншым асобам.

7. Вызначэнне аб разглядзе справы ў закрытым пасяджэнні Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь выносіць у дарадчым пакоі.

**Артыкул 37. Забеспячэнне паўнаты разгляду справы**

1. Пры падрыхтоўцы справы да разгляду і канстытуцыйнай вытворчасці па справе Канстытуцыйны Суд мае права:

1.1. запатрабаваць ад Сойму, Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада, Генеральнага пракурора, судоў, іншых органаў дзяржаўнай улады, органаў мясцовага самакіравання, службовых асоб, прадпрыемстваў, установаў, арганізацый усіх формаў уласнасці, палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў копіі дакументаў, матэрыялаў, а таксама звестак, якія датычацца справы;

1.2. прызначаць у выпадку неабходнасці экспертызу і прыцягваць спецыялістаў да ўдзелу ў канстытуцыйнай вытворчасці;

1.3. выклікаць на пасяджэнні, пленарныя пасяджэнні службовых асобаў, экспертаў, спецыялістаў, сведкаў, прадстаўнікоў суб'ектаў зваротаў, грамадзян, удзел якіх неабходны для забеспячэння аб'ектыўнага і поўнага разгляду справы.

2. Ухіленне ад удзелу ў пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда без уважлівых прычын, а таксама адмова прадаставіць запатрабаваныя дакументы, матэрыялы ды іншыя звесткі або іх наўмыснае ўтойванне цягне адказнасць па законе.

3. Па пытаннях, вынесеных на разгляд Канстытуцыйнага Суда, любой зацікаўленай асобай, якая не з'яўляецца заяўнікам, могуць падавацца пісьмовыя

абгрунтаваныя юрыдычныя заключэнні. Канстытуцыйны Суд па ўласным меркаванні вырашае пытанне аб іх далучэнні да справы і разгляду.

**Артыкул 38. Удзельнікі канстытуцыйнай вытворчасці**

1. Удзельнікамі канстытуцыйнай вытворчасці з'яўляюцца:

1.1. бакі - суб'екты права на канстытуцыйны зварот (канстытуцыйную скаргу) і орган або службовая асоба, якія прынялі акт, які з'яўляецца прадметам разгляду ў Канстытуцыйным Судзе;

1.2. прадстаўнікі бакоў - давераныя асобы, якім бакі ў парадку, зацверджаным законам, перадалі свае паўнамоцтвы. Прызначэнне прадстаўніка ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь з'яўляецца абавязковым, калі колькасць асоб, якія ўнеслі канстытуцыйны зварот, больш за дзве, а таксама калі асоба, якая ўнесла канстытуцыйны зварот, знаходзіцца пад вартай або ў месцах пазбаўлення волі. Паўнамоцтвы прадстаўніка боку павінны быць засведчаныя ў парадку, устаноўленым Грамадзянскім працэсуальным кодэксам;

1.3. прыцягнутыя Канстытуцыйным Судом да ўдзелу ў разглядзе справы органы і службовыя асобы, сведкі, эксперты, спецыялісты, перакладчыкі ды іншыя асобы, удзел якіх неабходны для забеспячэння аб'ектыўнага і поўнага разгляду справы (далей - прыцягнуты ўдзельнік канстытуцыйнай вытворчасці).

2. Аб прыцягненні органаў і службовых асобаў, сведкаў, экспертаў, спецыялістаў, перакладчыкаў ды іншых асобаў да ўдзелу ў пленарным пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда выносіцца адпаведнае вызначэнне.

3. Канстытуцыйны Суд можа перанесці разгляд справы, калі ўдзельнік канстытуцыйнай вытворчасці па ўважлівай прычыне не прыбыў на адпаведнае пасяджэнне.

4. Калі ўдзельнік канстытуцыйнай вытворчасці, належным чынам апавешчаны аб даце, часе і месцы разгляду справы, не прыбыў на адпаведнае пасяджэнне без уважлівай прычыны, Канстытуцыйны Суд разглядае справу у адсутнасць гэтага ўдзельніка.

5. Удзельнікі канстытуцыйнай вытворчасці ды іншыя асобы, якія прысутнічаюць у Зале пасяджэнняў Канстытуцыйнага Суда, могуць ажыццяўляць аўдыё- і відэазапіс адкрытай часткі пленарнага пасяджэння ў парадку, зацверджаным Рэгламентам.

**Артыкул 39. Правы і абавязкі ўдзельніка канстытуцыйнай вытворчасці**

1. Удзельнік канстытуцыйнай вытворчасці мае права:

1.1. знаёміцца з матэрыяламі справы, рабіць з іх выпіскі, здымаць копіі;

1.2. даваць вусныя і пісьмовыя тлумачэнні;

1.3. выказваць меркаванне па пытаннях, якія разглядаюцца;

1.4. задаваць з дазволу старшынствуючага пытанні іншым удзельнікам канстытуцыйнай вытворчасці;

1.5. заяўляць хадайніцтва;

1.6. падаваць заявы аб адводзе суддзі;

1.7. карыстацца іншымі правамі, прадугледжанымі гэтым Арганічным законам і Рэгламентам.

2. Хадайніцтвы ўдзельніка канстытуцыйнай вытворчасці, прадстаўленыя на пленарным пасяджэнні, разглядаюцца непасрэдна ў Зале пасяджэнняў або ў дарадчым пакоі.

**Артыкул 40. Тэрмін канстытуцыйнай вытворчасці**

1. Вылічэнне тэрмінаў канстытуцыйнай вытворчасці вядзецца з дня вынясення вызначэння аб адкрыцці канстытуцыйнай вытворчасці па справе.

2. Тэрмін канстытуцыйнай вытворчасці не павінен перавышаць чатырох месяцаў, калі іншае не прадугледжана гэтым Арганічным законам.

3. Тэрмін канстытуцыйнай вытворчасці не можа перавышаць двух месяцаў для справаў:

3.1. аб прадастаўленні заключэння аб адпаведнасці законапраекта аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю Беларусі патрабаванням артыкулаў Канстытуцыі Беларусі;

3.2. аб канстытуцыйнасці рашэння Сойма аб адхіленні ад пасады Прэзідэнта Беларусі;

3.3. у адносінах да якіх Канстытуцыйны Суд прызнаў канстытуцыйную вытворчасць неадкладнай;

3.4. аб прадастаўленні заключэння аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пытання, прапанаванага для вынясення на рэферэндум па народнай ініцыятыве;

3.5. аб канстытуцыйнасці рашэння аб прызначэнні датэрміновых выбараў прадстаўнічага органа мясцовага самакіравання на падставе звароту Сойма ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 118 Канстытуцыі.

4. Чарговасць разгляду спраў вызначаецца з улікам даты адкрыцця вядзення па канкрэтным звароце. У неабходных выпадках Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з улікам характару ды іншых абставінаў справы можа павялічыць час разгляду звароту.

**Артыкул 41. Аб'яднанне і раз'яднанне канстытуцыйных вытворчасцяў**

1. Калі ў Канстытуцыйны Суд паступіла некалькі зваротаў, якія датычацца аднаго і таго ж пытання або ўзаемазвязаных пытанняў, і па гэтых зваротах адкрытыя канстытуцыйныя вытворчасці, Канстытуцыйны Суд можа іх аб'яднаць у адну канстытуцыйную вытворчасць.

2. У выпадку неабходнасці Канстытуцыйны Суд на пленарным пасяджэнні можа прыняць рашэнне аб раз'яднанні канстытуцыйнай вытворчасці па справе ў асобныя канстытуцыйныя вытворчасці.

**Артыкул 42. Падрыхтоўка справаў да разгляду Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь**

1. Падрыхтоўку справы да разгляду ў Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе суддзя-дакладчык (або суддзі), якія прызначаюцца з дапамогай сістэмы аўтаматычнага размеркавання справаў пад кантролем Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Суддзя-дакладчык пры падрыхтоўцы справы:

2.1. вывучае пытанні, узнятыя ў звароце, і рыхтуе матэрыялы для разгляду Канстытуцыйным Судом;

2.2. запытвае дакументы, матэрыялы, іншую інфармацыю, якая мае дачыненне да справы, у суб'екта звароту, Сойму, Прэзідэнта, Урада Беларусі, Генеральнага пракурора, судоў, іншых органаў дзяржаўнай улады, органаў мясцовага самакіравання, службовых асобаў, прадпрыемстваў, установаў, арганізацый усіх форм уласнасці, палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў;

2.3. дае даручэнні адпаведным падраздзяленням канцылярыі і вызначае тэрміны іх выканання;

2.4. прыцягвае спецыялістаў для кансультацый, даследавання дакументаў;

2.5. уносіць у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прапановы аб прызначэнні экспертызы па справе, прыцягненні спецыялістаў да канстытуцыйнага судаводства, выкліку службовых асоб, экспертаў, спецыялістаў, сведак, упаўнаважаных асобаў, што дзейнічаюць ад імя суб'екта права на абскарджванне, а таксама грамадзян, удзел якіх можа садзейнічаць аб'ектыўнаму і поўнаму разгляду справы;

2.6. ажыццяўляе іншыя дзеянні, неабходныя для падрыхтоўкі справы да судовага разгляду.

3. Пасля завяршэння неабходных падрыхтоўчых дзеянняў суддзя-дакладчык ставіць пытанне перад Старшынёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь аб разглядзе звароту па сутнасці Канстытуцыйным Судом.

**Артыкул 43. Парадак разгляду звароту ў парадку вуснай вытворчасці**

1. Разгляд звароту па сутнасці пачынаецца з выступлення суддзі-дакладчыка, які прадстаўляе матэрыялы справы і адказвае на пастаўленыя пытанні суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Пасля даклада па справе Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь заслухоўвае спачатку тлумачэнні бакоў, пачынаючы з суб'екта звароту.

3. Заслухаўшы выступленні бакоў, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь заслухоўвае паказанні сведкаў, экспертаў і спецыялістаў, абвяшчае наяўныя ў справе і прадстаўленыя ўдзельнікамі разгляду справы доказы.

4. Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, які ўдзельнічае ў разглядзе, мае права задаваць пытанні бакам, сведкам, экспертам і спецыялістам.

5. Бакі маюць права з дазволу старшыні ставіць пытанні другому боку, сведкам, экспертам і спецыялістам.

6. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь пасля разгляду ўсіх наяўных у справе доказаў прадастаўляе бакам магчымасць выступіць з заключным словам, пачынаючы з суб'екта звароту.

7. Заслухаўшы заключныя выступленні, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь выдаляецца ў дарадчы пакой.

**Артыкул 44. Межы разгляду справы**

1. Зыходзячы з неабходнасці забяспечыць вяршэнства Канстытуцыі як адзінага акта і канстытуцыйны правапарадак, пры разглядзе справы Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь абавязаны не абмяжоўвацца межамі звароту, калі ўстанаўлівае, што падспрэчны прававы акт (яго палажэнне) супярэчыць Канстытуцыі па іншых матывах або іншых яе палажэннях, чым указаныя заяўнікам.

2. Пры разглядзе справы Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь можа прызнаць не адпаведнымі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншыя прававыя акты (або іх

палажэнні), якія не з’яўляліся прадметам звароту, але непасрэдна ўплываюць на разгляд справы або маюць істотнае значэнне для яе вырашэння.

## ГЛАВА 8. АСАБЛІВАСЦІ ВЫТВОРЧАСЦІ ПА СПРАВАХ АБ ЗМЯШЧЭННІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З ПАСАДЫ У ПАРАДКУ ПУНКТА 4 АРТЫКУЛА 92 КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 45. Забеспячальныя меры**

1. У выпадку адкрыцця вытворчасці па звароце Сойма, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь сваім рашэннем часова адхіляе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад выканання канстытуцыйных абавязкаў на перыяд разгляду справы аб яго змяшчэнні з пасады.

2. У гэтым выпадку часовае выкананне паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца згодна з артыкулам 93 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 46. Падрыхтоўка справы да разгляду**

1. З мэтай поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін справы Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь можа даваць даручэнні следчым органам у парадку, вызначаным Крымінальным працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

2. Указаныя ў частцы 1 паўнамоцтвы могуць ажыццяўляцца таксама суддзёй-дакладчыкам пры падрыхтоўцы справы да разгляду.

3. Суддзя-дакладчык дае магчымасць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь выказаць свае пярэчанні супраць прад'яўленага абвінавачання.

**Артыкул 47. Форма вытворчасці**

1. Разгляд справы ажыццяўляецца ў парадку вуснай вытворчасці на адкрытых пасяджэннях з трансляцыяй на афіцыйных інтэрнэт-рэсурсах Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. З мэтай забеспячэння нацыянальнай бяспекі, абароны персанальных даных даследаванне асобных доказаў можа ажыццяўляцца па рашэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у закрытым рэжыме.

**Артыкул 48. Працэдура разгляду справы**

1. Працэдура разгляду справы ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным гэтым Арганічным законам, з улікам патрабаванняў Крымінальнага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, устаноўленых для гарантавання спаборнасці працэсу разгляду справы.

2. Разгляд справы пачынаецца з прад'яўлення абвінавачання, выкладзенага ў звароце. Абвінавачанне прадстаўляе ўпаўнаважаная Соймам Рэспублікі Беларусь асоба, якая мае вышэйшую юрыдычную адукацыю і стаж працы ў галіне права не менш за 10 гадоў.

3. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь можа самастойна ажыццяўляць сваю абарону ці карыстацца паслугамі адваката.

4. У выпадку адмовы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад удзелу ў вытворчасці па суб'ектыўных абставінах самастойна або праз прадстаўніка Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае справу ў адсутнасць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прызначае яму прадстаўніка па законе.

5. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь даследуе ўсе доказы паслядоўна, пачынаючы з доказаў, выкладзеных у звароце.

6. Адстаўка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прынятая Соймам Рэспублікі Беларусь у перыяд разгляду справы, як і спыненне паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па іншых падставах (акрамя смерці), не з'яўляецца падставай для прыпынення або спынення вытворчасці па справе.

**Артыкул 49. Прыняцце рашэння, яго змест і юрыдычныя наступствы**

1. Рашэнне па справе прымаецца не менш як дзвюма трэцімі ад поўнага складу Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. У рашэнні па справе ўстанаўліваецца, ці з’яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь вінаватым у парушэнні Прысягі або ўчыненні злачынства. У выпадку прызнання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вінаватым у парушэнні Прысягі або ўчынення злачынства, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь пастанаўляе аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады з моманту абвяшчэння рашэння (акрамя выпадкаў датэрміновага спынення паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па іншых падставах да прыняцця рашэння Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь).

3. Рашэнне неадкладна накіроўваецца Старшыні Сойму Рэспублікі Беларусь для забеспячэння правапераемнасці пры ажыццяўленні паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. У выпадку прызнання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вінаватым ва ўчыненні злачынства рашэнне накіроўваецца таксама Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь для ажыццяўлення далейшых працэсуальных дзеянняў, неабходных для прыцягнення вінаватых асоб да крымінальнай адказнасці.

## ГЛАВА 9. РАШЭННІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 50. Прыняцце рашэння па справе**

1. Рашэнне па справе прымаецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь на закрытай частцы пленарнага пасяджэння большасцю галасоў суддзяў, якія прымалі ўдзел у разглядзе справы,, у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 8 гэтага Арганічнага закону.

2. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы, абавязаны прагаласаваць "за" ці "супраць" рашэння і не мае права ўстрымацца ад удзелу ў галасаванні.

3. Рашэнне падпісваецца ўсімі суддзямі, якія прымалі ўдзел у разглядзе справы.

4. Суддзя мае права, а ў выпадку нязгоды з прынятым рашэннем — абавязаны, выкласці сваю асобную думку, якая падлягае абнародаванню ў парадку, прадугледжаным для абнародавання рашэння. Магчыма таксама прадстаўленне агульнай асобнай думкі некалькімі суддзямі.

**Артыкул 51. Структура рашэння**

1. Рашэнне складаецца з уступнай, матывацыйнай і рэзалютыўнай частак.

2. Ва ўступнай частцы ўказваюцца склад Канстытуцыйнага Суда, які разглядае справу, бакі і іншыя ўдзельнікі канстытуцыйнага судаводства, падаецца сутнасць справы, пазіцыі бакоў і іншых удзельнікаў канстытуцыйнага судаводства, кароткае апісанне ходу разгляду справы.

3. У матывацыйнай частцы даецца аналіз прадмета разгляду - аспрэчанага прававога рэгулявання (палажэнняў міжнароднай дамовы), дзеі, акта, якія ставяцца ў віну як парушэнне Канстытуцыі або прысягі, або прыніжэнне канстытуцыйных правоў, зацверджанай кампетэнцыі дзяржаўных органаў, прапанаванай фармулёўкі пытання рэферэндуму, прапанаванай прапанаванай канстытуцыйнай папраўкі. Таксама ў матывацыйнай частцы даецца афіцыйнае тлумачэнне Канстытуцыі (афіцыйная канстытуцыйная дактрына) і ацэнка прадмета разгляду ў кантэксце прадстаўленага афіцыйнага тлумачэння Канстытуцыі.

4. У рэзалютыўнай частцы фармулюецца рашэнне па справе - аб канстытуцыйнасці аспрэчанага прававога рэгулявання (палажэнняў міжнароднай дамовы), прапанаванай фармулёўкі пытання рэферэндуму, прапанаванай канстытуцыйнай папраўкі, дзеяння (акта), зацверджанай кампетэнцыі дзяржаўных органаў, іншае. Пры неабходнасці перад гэтым Канстытуцыйны Суд можа выкласці тлумачэнне наступстваў або парадку выканання рашэння.

5. Калі ў справе пададзена асобная думка, яна прыкладаецца да рашэння. Асабная думка падаецца суддзёй праз Канцылярыю Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь не пазней за дзень апублікавання самога рашэння.

6. Іншыя пытанні, якія датычацца структуры рашэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, вызначаюцца Рэгламентам Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 52. Аб'ява рашэння і ўступленне яго ў сілу**

1. Рашэнне абвяшчаецца публічна на пленарным пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Як правіла, калі іншае не вызначана Канстытуцыйным Судом у канкрэтнай справе, Канстытуцыйны Суд абвяшчае на пленарным пасяджэнні ўступную і рэзалютыўную часткі, абазначаючы асноўныя матывы прыняцця рашэння.

2. Не пазней чым на наступны дзень пасля абвяшчэння рашэння яго поўны афіцыйны тэкст публікуецца ў афіцыйным рэестры прававых актаў, а таксама на афіцыйным вэб-сайце Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Рашэнне ўступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Артыкул 53. Юрыдычная сіла рашэння**

1. Рашэнне з'яўляецца канчатковым і абскарджанню не падлягае.

2. Рашэнне з'яўляецца абавязковым у поўным аб'ёме для ўсіх асоб, якія знаходзяцца пад юрысдыкцыяй Рэспублікі Беларусь.

3. Забараняецца пераадольваць юрыдычную сілу рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь шляхам прыняцця прававога рэгулявання, якое прызнана супярэчным дзеючай Канстытуцыі, або шляхам здзяйснення іншых дзеянняў, антыканстытуцыйнасць якіх устаноўлена рашэннем (акрамя выпадкаў унясення адпаведных змяненняў і (або) дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь).

4. Рашэнне можа быць перагледжана толькі Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь і толькі ў тым выпадку, калі яму становяцца вядомыя істотныя абставіны, якія існавалі падчас разгляду справы і маглі б прывесці да іншага рашэння, калі б былі вядомыя Канстытуцыйнаму Суду. Пасля адкрыцця вытворчасці па перaглядзе рашэння да яе прымяняецца парадак судаводства, устаноўлены гэтым Арганічным законам, з неабходнымі змяненнямі.

**Артыкул 54. Наступствы рашэння**

1. Прававы акт (або яго частка), прызнаны Канстытуцыйным Судом не адпаведным Канстытуцыі, страчвае юрыдычную сілу з дня, указанага ў рашэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Як правіла, гэта дзень уступлення ў сілу рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь можа пастанавіць, што прававы акт (або яго частка), прызнаны Канстытуцыйным Судом не адпаведным Канстытуцыі, страчвае юрыдычную сілу праз пэўны час пасля ўступлення ў сілу рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, калі такі час неабходны для належнага выканання рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і для недапушчэння прабелаў у прававым рэгуляванні, істотнай дэстабілізацыі дзяржаўнага кіравання або дзяржаўнага бюджэту, ці іншага істотнага парушэння грамадскага інтарэсу.

3. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь можа пастанавіць, што прававы акт (або яго частка), прызнаны Канстытуцыйным Судом не адпаведным Канстытуцыі, прызнаецца нікчэмным (які не мае юрыдычнай сілы) і не маючым за сабой прававых наступстваў у тых выпадках, калі Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь устанаўлівае, што такі акт уяўляе сабой грубае парушэнне пункта 1 артыкула 1 Канстытуцыі або ўяўляе сабой спробу пераадолення юрыдычнай сілы раней прынятага рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

4. Незалежна ад таго, калі прававы акт (або яго частка), прызнаны Канстытуцыйным Судом не адпаведным Канстытуцыі, страчвае юрыдычную сілу, ён не можа прымяняцца судом, які звярнуўся ў Канстытуцыйны Суда Рэспублікі Беларусь, пры вырашэнні справы, у якой узнікла пытанне аб канстытуцыйнасці прымененага прававога рэгулявання.

5. Пры вырашэнні справы на падставе канстытуцыйнай скаргі, калі Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь зацвярджае прыніжэнне канстытуцыйных правоў і свабод фізічных і юрыдычных асоб, таксама прымаюцца канкрэтныя меры па аднаўленні прыніжаных канстытуцыйных правоў і свабод, уключаючна з, па патрабаванні заяўніка, кампенсацыяй прынесенай матэрыяльнай і маральнай шкоды.

**Артыкул 55. Выкананне рашэння**

1. Невыкананне, неналежнае выкананне або перашкаджанне выкананню рашэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь цягне адказнасць па законе.

2. Па просьбе любога з бакоў справы або асобы, якой належыць выкананне рашэння, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь мае права даць тлумачэнне, неабходнае для выканання рашэння. Да працэсу па растлумачэнні рашэння прымяняецца парадак судаводства, устаноўлены гэтым Арганічным законам, з неабходнымі змяненнямі.

# РАЗДЗЕЛ IV. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 10. ЗАКЛЮЧНЫЯ І ПЕРАХОДНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АРГАНІЧНАГА ЗАКОНА

**Артыкул 56. Спыненне паўнамоцтваў дзейнага складу Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Дзейны склад Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь спыняе свае паўнамоцтвы неадкладна пасля ўступлення ў сілу Канстытуцыі новай Беларусі або правядзення першых дэмакратычных выбараў (у залежнасці ад таго, што адбудзецца раней).

2. Рашэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, прынятыя пасля 5 снежня 1996 года, прызнаюцца страціўшымі юрыдычную сілу.

**Артыкул 57. Уступленне ў сілу Закона аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь**

Закон аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу з дня яго апублікавання.

**Артыкул 58. Фармаванне Канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**

1. Сакратарыят дзейнага Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь на працягу 30 дзён пасля стварэння новага Канстытуцыйнага Суда правяраецца на наяўнасць неабходнай кваліфікацыі, а таксама наяўнасць або адсутнасць кампраметуючых абставінаў у папярэдняй дзейнасці. У выпадку паспяховага праходжання праверкі пераназначаюцца ў Канцылярыю новага Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці са штатна-арганізацыйнай структурай Канцылярыі. Пры адсутнасці магчымасцяў працаўладкавання асобаў, якія прайшлі праверку, звальняюцца ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, з выплатай адпаведнай дапамогі.

2. Праверку ажыццяўляе камісія, склад якой зацвярджаецца Старшынёй Канстытуцыйнага Суда па прадстаўленні кіраўніка Канцылярыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Канцылярыя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе прыёмку будынка Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і іншай маёмасці ў кіраўнікоў Сакратарыята ў адпаведнасці з інвентарызацыйным вопісам, а архіўныя матэрыялы па адпаведным пераліку.